Запрашаем у Тракелі 11–12 ліпеня

Аўтар: кс. Павел Салабуда
05.06.2014 01:00

З кусташам санктуарыя ў Тракелях кс. Аляксандрам Рудзевічам на тэму сёлетніх дзён малітвы і дзейнасці санктуарыя размаўляе кс. Павел Салабуда. ***– Вы ўжо другі год з'яўляецеся кусташам санктуарыя. У чым цяпер заключаюцца Вашы абавязкі, і што новага сустрэла Вас на шляху духоўнай апекі над санктуарыем?***

– Мой першачарговы абавязак – гэта св. Імша: як для тых, хто прыбывае наведаць гэтае асаблівае месца, так і для саміх парафіян. Многія людзі просяць аб споведзі. Ёсць таксама справы і абавязкі, звязаныя з будаўніцтвам Дома пілігрыма, які мы за гэты час скончылі. Цяпер мы прыводзім у парадак тэрыторыю вакол касцёла, на якой мы плануем зрабіць стацыі і дарожкі Крыжовага шляху. Каля санктуарыя мы збіраемся добраўпарадкаваць спецыяльную тэрыторыю, якая ў будучым зможа паслужыць пілігрымам. Санктуарый – гэта месца духоўнага адпачынку, а таму пілігрымы, якія будуць прыязджаць сюды, адпачнуць фізічна і духоўна, выпрошваючы ў Маці Божай неабходныя ласкі. †

– Калі адбудуцца сёлетнія ўрачыстасці, і які будзе дэвіз гэтых дзён малітвы?

– Ад імя кс. біскупа Аляксандра сардэчна запрашаю ўсіх прыхільнікаў Маці Божай Тракельскай на начное чуванне і на галоўныя ўрачыстасці, якія ў гэтым годзе пройдуць 11–12 ліпеня. Дэвізам сёлетняй сустрэчы будуць словы: "А пад крыжам Маці стаяла".

– Ксёндз Аляксандр, ці будзе штосьці новае ў плане начной адарацыі?

– Перш за ўсё, гэта прыбыццё ў наш санктуарый і ўрачыстае прывітанне крыжа і іконы Маці Божай – сімвалаў Сусветных дзён моладзі. Адбудзецца адарацыя і супольная малітва пры крыжы. У гэтым годзе будзе таксама адпраўлены Крыжовы шлях, і адбудзецца медытацыя пры іконе Маці Божай. Новым пунктам будзе магчымасць паразмаўляць з ксяндзамі біскупамі і задаць ім пытанне.

– Ці змянілася што-небудзь у санктуарыі ў матэрыяльным плане?

– Як я ўжо прыгадваў вышэй, быў упарадкаваны Дом пілігрыма і тэрыторыя вакол яго. Безумоўна, мы далей працуем над тым, каб пілігрымы добра сябе ў нас адчувалі.

– Скажыце калі ласка, пілігрымкі ў санктуарыі ёсць на працягу ўсяго года, ці яны прыбываюць толькі летам?

– На працягу года ў санктуарый таксама прыбываюць шматлікія вернікі, каб пакланіцца Маці Божай. Яны хочуць, каб у гэтым святым месцы была адпраўлена Эўхарыстыя ў іх інтэнцыі. Ёсць вельмі шмат малітваў: просяць аб здароўі, аб паспяховай здачы экзаменаў,

аб цвярозасці кагосьці з сям'і. Гэтыя просьбы складаюць жыццё гэтых людзей. Амаль штодзённа ёсць хтосьці, хто б хацеў памаліцца і зайсці ў касцёл. Людзі прыязджаюць таксама з-за мяжы.

Карыстаючыся нагодай, я хацеў бы запрасіць усіх прыехаць, каб памаліцца перад цудатворным абразом Маці Божай у санктуарыі. Запрашаю на галоўныя ўрачыстасці, каб разам з ксяндзамі біскупамі перажыць побач з Марыяй, Каралевай нашых сем'яў, незабыўныя хвіліны, каб стаць пад крыжам Езуса разам з Маці і выпрошваць патрэбныя ласкі на кожны дзень.

– Вялікі дзякуй Вам за размову!

Праграма ўрачыстасцей у дыяцэзіяльным санктуарыі ў Тракелях 11–12 ліпеня 2014 года

"А пад крыжам Маці стаяла"

11 ліпеня – пятніца

21.00	– прывітанне крыжа і іконы Сусветных дзён моладз
21.15	– канферэнцыя;
22.00	– адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту;
23.00	– Крыжовы шлях вуліцамі Тракеляў.

12 ліпеня – субота

24.00	– св. Імша пастэрка;
02.00	– Ружанцовая малітва – Балесная частка;
03.00	– Вяночак да Божай міласэрнасці;
04.00	– канцэрт;
05.00	– Гадзінкі аб Беззаганным Зачацці НПМ;
06.00	– спеў традыцыйных песень;
07.00	– падрыхтоўка да св. Імшы;
07.30	– св. Імша пад кіраўніцтвам ксяндзоў новапрэзбітэр
08.30	– размова моладзі з біскупамі;
09.30	– падрыхтоўка да св. Імшы;
10.00	– адпустовая св. Імша, развітанне з крыжам і іконай

У праграме магчымы змены.